# Гісторыя

***А.Ул. ЛЮБЫ***

## ЦАРКОЎНАЯ УНІЯ І АДНОСІНЫ ДА ЯЕ КАНФЕСІЙ І ДЗЯРЖАВЫ Ў ВЯЛІКІМ КНЯСТВЕ ЛІТОЎСКІМ (1430-1440)

Анализируется период подготовки и заключения Флорентийской унии через отношения между церковными структурами и структурами власти в Великом княжестве Литовском в 1430-1440-х гг.; отмечается политический характер поддержки властью движения воссоединения Церкви.

The period of preparation and conclusion of the Union of Florence is analyzed through relations between the church establishment and the state authority of the Grand Duchy of Lithuania. It is pointed out that power support of the union movement had political nature.

Адносіны паміж царквой і дзяржавай у гістарычнай літаратуры разглядаюцца як стасункі царквы і грамадства, іерархаў і кіруючых колаў. Дэфініцыі царква і грамадства (сацыяльнае цэлае з уласнымі задачамі) амаль атаясамліваюцца. У традыцыйным грамадстве сродкам для дасягнення рэлігійнай мэты з'яўляецца дзяржава. Ва ўмовах ідэалагічнай дактрыны "свяшчэннай хрысціянскай дзяржавы" (дзяржава і царква скпадаюць адно цэлае) і візантыйскай "тэорыі сімфоніі Царквы і дзяржавы" манарх (цар, васілевс) як асоба сакральная разглядаецца ў іерархіі царквы не ў меншай ступені, чым епіскап (патрыярх, мітрапаліт)[1]. У Вялікім княстве Літоўскім (далей - ВКЛ) першай паловы XV ст. можна адзначыць накладанне на традыцыю рэалій заходняга хрысціянскага свету: прымат царкоўнай улады над свецкай і ідэй "саборнага руху", які дазваляў кантроль дзяржаўнай улады над свецкім жыццём. Такім чынам, сітуацыя секулярызацыі ідэі царкоўнай уніі ўладамі ВКЛ мела характар адаптацыі дзяржавай легальных механізмаў поўнага кантролю над грамадствам.

Пытанні ўзаемаадносін дзяржавы і канфесій у ВКЛ у перыяд "саборнага руху" і перамоў пра аб'яднанне цэркваў напярэдадні і пасля Ферара-Фларэнтыйскага сабора ў айчыннай гістарыяграфіі спецыяльна не разглядаліся. Для рускай царкоўнай гістарыяграфіі характэрны погляд на ўдзел рускіх іерархаў у працы ўсходне-заходніх перамоў пра аб'яднанне Царквы з пазіцый маскоўскіх і маскоўскага ўдзелу (дакпадней неўдзелу, адмежавання)[2]. Нягледзячы на тое, што ў польскай гістарыяграфіі змяшчаецца характарыстыка працэсаў царкоўна-дзяржаўнага супрацоўніцтва на землях ВКЛ, перавага ў іх аддаецца пытанням палітычнай уніі[3]. Усталяванне Каталіцкай царквы на землях ВКЛ разглядаецца праз талерацыю (цярплівасць) да суіснавання з Праваслаўнай царквой[4].

Тэрыторыя ВКЛ да 1430 г. уваходзіла ў восем епіскапстваў, належных Праваслаўнай царкве (каля 80 % ад хрысціянскіх вернікаў дзяржавы)[5], і пяць епіскапстваў (дыяцэзій) - Каталіцкай. Праваслаўныя епархіі кананічна належалі Рускай (Кіеўскай) мітраполіі Канстанцінопальскага патрыярхату, якая з 1420 г. была ўз'яднана пад амафорам мітрапаліта Фоція са згоды вялікага князя Вітаўта і ўкпючала тэрыторыі дзвюх дзяржаў, Вялікіх княстваў Літоўскага і Маскоўскага.

Падобная сітуацыя склалася і ў Царкре заходняй традыцыі: каталіцкія дыяцэзіі, Віленская і Медніцкая (Жамойцкая), уваходзілі ў архібіскупства Гнезненскае, а дыяцэзіі Уладзімірская (Луцкая), Холмская і Камянецкая - у Львоўскае.

Паўночныя і паўднёвыя дыяцэзіі ВКЛ тэрытарыяльна ўваходзілі ў царкоўныя адміністрацыйныя падпарадкаванні, сумесныя з Каралеўствам Польскім.

Ніводная з канфесій на тэрыторыі ВКЛ не мела ўласнай вышэйшай царкоўнай іерархіі монадзяржаўнага характару. Відавочна, такое становішча было невыгодна дзяржаве ва ўмовах геапалітычнага канфлікту і слабасці ўсяленскай царквы (патрыярхату, папства).

Стан Праваслаўнай царквы Канстанцінопальскага патрыярхату вызначаўся ў XIV ст. катастрафічным палітычным становішчам Імперыі і духоўным уздымам, які меў наднацыянальны характар царкоўнага адзінства і быў выкліканы так званым "ісіхасцкім рухам"[6]. На Захадзе грамадства жыло ў час Саборнага руху. Сітуацыя сведчыла пра актывізацыю свецкай улады і ўплыву нацыянальнага фактару ў царкве.

Царкоўная эклезіялогія на Захадзе і Усходзе хрысціянскай Еўропы рознілася і абумоўлівала свецкія і царкоўныя адносіны ў дзяржаве і ў перамовах паміж канфесіямі пра ўз'яднанне. У Праваслаўнай царкве нормай з'яўляецца "сімфонія" царкоўнай і свецкай улад. На Захадзе інстытут Папы прэтэндаваў на кантроль за свецкім жыццём. Нягледзячы на палітычны падтэкст перамоў Канстанцінопаля з Захадам пра дапамогу ў барацьбе супраць асманаў, перамовы пра унію характарызаваліся пошукам уз'яднання Царквы, а не безапеляцыйным прыняццем заходніх асноў веры[7].

У ВКЛ такое становішча абумовіла ўмяшанне ўлад у царкоўныя справы і прыцягненне мясцовай іерархіі да палітычнага жыцця. З іншага боку, з'яўленне нацыянальных епіскапаў актывізавала ўдзел іерархаў у свецкім жыцці, палітызацыю і ў некаторым сэнсе заангажыраванасць, ствараючую ўмовы цеснага выкарыстання дзяржавай Царквы як сацыяльнага элемента, а Царквой - магчымасцей дзяржаўнай улады ў выпраўленні свайго прававога і матэрыяльнага становішча.

Унутрыпалітычны курс улад у дачыненні да Праваслаўнай царквы ў XIV - пачатку XV ст. меў два сцэнарыя выпраўлення сітуацыі. Першы - праз адкрыц-цё Літоўскай мітраполіі, падпарадкаванай наўпрост Канстанцінопалю, у складзе епархій, што знаходзіліся на тэрыторыях, падкантрольных ВКЛ. Адзначаны варыянт праводзілі вялікія князі Гедымін, Альгерд (1356), Вітаўт. Другі сцэнарый - усталяванне палітычнага кантролю над усёй Кіеўскай мітраполіяй: вяртанне ў Кіеў ці перанясенне на тэрыторыю ВКЛ мітрапаліцкай кафедры "ўсёй Русі". Асноўны праваднік такой палітыкі - вялікі князь Альгерд, а таксама Вітаўт, які па смерці мітрапаліта Кіпрыяна прапаноўваў паставіць на Кіеўскую мітраполію полацкага ўладыку Феадосія, але ў Канстанцінопалі кандыдатура не была падтрымана . Вялікі князь Свідрыгайла Альгердавіч рэалізаваў палітычны курс бацькі ў 1432-1433 г., спрыяўшы пастаўленню на Кіеўскую мітраполію Смаленскага епіскапа Герасіма.

Саюз з Польшчай з канца XIV ст. вымагаў ад улады спрыяння дзейнасці Каталіцкай царквы на землях ВКЛ. Касцёл на тэрыторыі Княства з'яўляецца пасля каланізацыі Польшчай сумежных зямель. Так папа Грыгорый XI стварыў у сярэдзіне 1370-х гг. архібіскупства ў Галічы для польскай Русі, цэнтрам якога хутка стаў Львоў. У архібіскупства ўключаліся біскупствы ў Перамышлі, Холме, Уладзіміры (затым Луцку) і, утвораныя пазней, у Камянцы і Кіеве[9]. Ніводная з дыяцэзій не была падобна ні па пастве, ні па заможнасці, ні па колькасці парафій да польскіх. У 1387 г. новаабраны кароль Польшчы і вялікі князь літоўскі Уладзіслаў-Ягайла закладае Віленскую дыяцэзію, у якую ўваходзяць беларускія землі ВКЛ. Добра забяспечаная епархія пачала развіваць парафіяльную структуру не толькі на этнічных літоўскіх землях, але і на рускіх, дзе мелася сетка праваслаўных прыходаў[10]. Першапачаткова біскупства падзялялася на сем парафій: тры знаходзіліся на тэрыторыі Беларусі ў Абольцах, Гайне, Крэве, а да 1430 г. на Беларусі было заснавана яшчэ дваццаць парафій. На пачатку XV ст. нарэшце з'явілася Медніцкая дыяцэзія ў Жамойці. Даследчык М. Косман адзначае, што сам Касцёл за часы Ягайлы і Вітаўта не прафінансаваў ніводнай парафіі". Напачатку сродкі на абедзве дыяцэзіі давалі манархі, але з часам ініцыятыва пераходзіць да набілітэту. Біскупствы Вільны і Меднікаў былі ўключаны ў Гнезненскую мітраполію, абодва біскупы прысутнічалі на памесных

саборах на чале з прымасам[12]. Парафіі не былі аднолькавыя па дымам, як следства - па заможнасці. Праблема кадраў (асабліва мясцовых) ускладнялася заняццем больш перспектыўных кафедраў радавітымі святарамі[13]. Пры ўсім гэтым касцёльныя інстытуцыі на землях ВКЛ развіваліся імкліва.

Функцыянаванне грамадства адзначаецца з'яўленнем "нацыянальных" матываў, што ў Касцёле азначыліся з прыходам на Віленскую кафедру біскупа Марціна, які абавязваў духавенства вывучаць мясцовую мову, каб на ёй чытаць пропаведзь простаму народу[14]. Царкоўны гісторык М. Лапіцкі тлумачыць спробу атрымаць уласнага праваслаўнага мітрапаліта "развіццём царкоўнай праваслаўнай іерархіі ў ВКЛ"[15]. Даследчык А. Мірановіч падзеі ад Сабора ў Наваградку (1415) да пакарання мітрапаліта Герасіма характарызуе ініцыятывай грамадства "мець уласную... царкву", містычны бок тлумачыцца з'яўленнем на беларускіх землях цудадзейных абразоў Божай Маці ў Менску і Смаленску[16]. Так з прыходам да ўлады вялікага князя Свідрыгайлы прадстаўнікі абедзвюх канфесій пачалі весці сябе больш актыўна. Іерархі па-рознаму ўспрымалі сваю ролю згодна з розніцай у адносінах да ўсведамлення сацыяльнай і палітычнай ролі ў грамадстве.

Шматканфесійная дзяржава несла ў сабе патэнцыял нестабільнасці. Улады ВКЛ бачылі выйсце ў спрыянні працэсам аб'яднання канфесій-цэркваў на тэрыторыі дзяржавы. Але Праваслаўная і Каталіцкая цэрквы бачылі ў аб'яднанні розныя багаслоўскія і палітычныя мэты. На думку багаслова П. Еўдакімава, "...поўны і зусім незваротны правал спроб уніі... выяўляе бясплоднасць усялякай капітуляцыі як сродку вырашэння дагматычнага канфлікту"[17]. Па пастановах Фларэнтыйскага сабора Папа з'яўляўся главой усіх памесных цэркваў і, як следства, усёй Царквы.

Для ўлад ВКЛ характэрна імкненне да цэнтралізатарскай палітыкі. Пры шматнацыянальным і шматканфесійным складзе насельніцтва працэсы аб'яднання Царквы мінімізуюцца інтарэсамі груп. Спроба за кошт уніфікацыі канфесійнага становішча дзяржавы вырашыць пытанне цэнтрабежных сіл узнікала яшчэ да XV ст. Так дыялог Альгерда з прадстаўнікамі Праваслаўнай царквы цягнуў за сабой праваславізацыю дзяржавы (перамовы вяліся і з ягоным сынам Ягайлам)[18]. Хрышчэнне Ягайлы ў Кракаве абумовіла каталіцызацыю ВКЛ, падтрыманую Вітаўтам пасля паражэння на Ворскле. Сітуацыя змяняецца з прыходам да ўлады вялікага князя Свідрыгайлы Альгердавіча. З пачаткам барацьбы за вялікакняжацкі пасад паміж Свідрыгайлам і Жыгімонтам працэс кансалідацыі і уніфікацыі дзяржавы з уласнапалітычнага становішча царкоўна-палітычным.

У хрысціянскай Еўропе вялася падрыхтоўка да ажыццяўлення уніі паміж Праваслаўнай і Каталіцкай цэрквамі. Вопыт кантактаў епіскапа Герасіма з За-ходняй царквой стаў у 1432 г. падставай пастаўлення кандыдата, дасланага з ВКЛ, на Кіеўскую мітраполію. Вялікі князь Свідрыгайла ўспрымаў працэс уніі як "ахоўную грамату" і чарговы палітычны ход у вайне з апанентам і Польшчай за ВКЛ. Для князя мітрапаліт быў толькі пешкай, з якой ён растаўся, адчуўшы ад-сутнасць падтрымкі (мітрапаліт Герасім у ліпені 1435 г. спалены за палітычную здраду)[19]. Для вялікага князя Свідрыгайлы было выгадна адстойваць папу Яўгена IV, бо такая пазіцыя пэўным чынам гарантавала станоўчыя адносіны з імператарам і Ордэнам (ва ўмовах непрызнання Польшчай і вялікім князем Жыгімонтам Кейстутавічам папы)[20]. Акт уніі быў падпісаны 5 ліпеня 1439 г. у італьянскім горадзе Фларэнцыя, а на раніцу ўрачыста абвешчаны.

Як адзначае Е. Клачоўскі, уражвае тое, што, нават калі рэалізацыя была непазбежнай, саюз дзвюх Цэркваў на тэрыторыі ВКЛ і Польшчы да XVI ст. вызна-чаўся слабасцю і непрацягласцю[21]. Для манархаў ВКЛ і Польшчы пытанне, звя-занае з Праваслаўнай царквой, было складаным не столькі з рэлігійнага пункту гледжання, колькі з палітычнага, бо парушыўся стары лад Кіеўскай мітраполіі, цэнтр якой знаходзіўся ў Маскве. Праваслаўныя іерархі ВКЛ цярпліва ставіліся да уніі ва ўмовах царкоўнага, непалітычнага, разумения з'явы. Так мітрапаліт Рыгор Цамбалак, вядомы праваслаўны багаслоў, прысутнічаў на Канстанцкім саборы, дзе закранался пытанне уніі, і адстойваў асновы праваслаўнага веравучэння.

На саборы ў Фларэнцыі прысутнічаў мітрапаліт Кіеўскі і ўсёй Русі Ісідор, але адсутнічалі прадстаўнікі каталіцкай іерархіі з Польшчы. Да таго ж сам "унійны

курс" Свідрыгайлы, на думку гісторыка Ф. Дворніка, адштурхнуў ягоных саюз-нікаў у славянскіх землях, а таксама караля Уладзіслава-Ягайлу і вялікага князя Жыгімонта[22]. Крокамі апошніх для выпраўлення ўнутрыпалітычнага становішча ў Княстве сталі прывілеі, якія ўраўноўвалі праваслаўны набілітэт з каталіцкім. Падазроныя адносіны да уніі захоўваліся ў польскай палітыцы некаторы час пасля Фларэнтыйскага сабора.

Мітрапаліт Ісідор знаходзіўся на землях ВКЛ ужо ў 1440 г., але унію праіг-наравалі і праваслаўныя, і каталіцкія іерархі ў Літве і Польшчы, апошнія пад-трымлівалі папу Фелікса V (абранага Базэльскім саборам) і да 1443 г. не прыз-навалі дзейсным акт. Да уніі цярпіма аднесліся толькі ў Кіеве, Смаленску і нека-торых гарадах Княства. Прызнанне яе князем Юрыем Лугвенавічам, які на ка-роткі час 1440-1441 гг. аднавіў удзельнае Смаленскае княства і разлічваў на падтрымку Рыма ў сваёй барацьбе, - адна з прычын, у сувязі з якой кіруючыя колы ВКЛ у той час не прызналі Фларэнтыйскую унію. Унія была скасавана ў 1443 г. Іерусалімскім патрыярхам і царкоўнымі саборамі: Канстанцінопальскімі 1450 і 1472. У ВКЛ і Польшчы ўлады падтрымалі царкоўную унію ў 1458 г. Да пачатку XVI ст. некаторыя Кіеўскія мітрапаліты фармальна лічылі Фларэнтый-скую унію сапраўднай на тэрыторыі Польшы і ВКЛ, але такая пазіцыя не ўплывала на жыццё духавенства і вернікаў.

Унутрыпалітычнай перавагі дзяржаўная ўлада не атрымала. Працэс адасаб-лення зямель ВКЛ ад цэнтра Рускай мітраполіі, які застаўся ў Маскве, расцяг-нуўся на дзесяцігоддзі і не з'яўляўся такім актуальным, як у XIV ст. Аб'яднанне грамадства не адбылося, І правы вернікаў выпраўляліся да другой паловы XVI ст. праз земскія і агульнадзяржаўныя прывілеі. Спробы далучыць царкоўную іерархію да актыўнага палітычнага жыцця дзяржавы былі дасягнуты натуральна праз з'яўленне епіскапаў - ураджэнцаў ВКЛ, якія, акрамя служэння Богу, мелі і ўласную палітычную пазіцыю.

1 Гл.: Память и беспамятство в церкви и обществе: итоги XX века: Материалы междунар. науч.-богословской конф. (Москва, 18-20 сентября 2000 г.). М., 2004. С. 41, 267-168, 179.

2 Гл.: Макарій ( Булгаков ) . Історія Русской Церкви. СПб., 1879. Т. IX. Кн. IV; Голубинский Е. История Русской Церкви: В 2 т. М., 1997. Т. 2; Карташев А. В. История Русской Церкви: В 2 т. М., 2000. Т. 1 ; Мейендорф И. Духовное и церковное возрождение 14 века и судьбы Вос-точной Европы. МН., 1992; История Церкви и восточно-христианская мистика. М., 2000.

3 Гл.: Fijatek J. Biskupstwa greckie w ziemiach ruskich od potowy w. XIV. Na podstawie zrodet greckich // Kwartalnik historyczny. 1897. R. XI. S. 1-63; L e w i c k i A. Unia Flirencka w Polskie. Krakow, 1899; C h o d y n i c k i K. Kosciot Prawostawny a Rzeczpospolita Polska. Zarys historyczny 1370-1632. Warszawa, 1934; Halecki 0. From Florence to Brest (1439-1596). Rome, 1958; Ktoczowski J. Histoir religieuse de la Pologne. Paris, 1987.

4 Гл.: Kosman M . Od chrztu do chrystianizacji. Polska-Rus-Litwa. Warszawa, 1992.

5 Гл.: Бардах Ю . Дачыненьні паміж каталікамі і праваслаўнымі ў Вялікім Княстве Літоўскім (канец XIV-XVII ст.) // Беларускі Гістарычны Агляд. 1994. Т. 1. Сш. 1. С. 67.

6 Гл.: Мейендорф И. Духовное и церковное возрождение... С. 51-52, 54.

7 Гл.: Уэр К. Православная церковь. М., 2001. С. 76-78.

8 Мейендорф И. История Церкви... С. 518; Памятники древнерусского канонического права // Русская историческая библиотека. СПб., 1880. Т. IV. Стлб. 329; Акты, относящиеся к истории Запад-ной России, собранные и изданные археографической комиссией. СПб., 1846. Т. 1. С. 36.

9 Гл.: Макарій (Булгаков). Указ. пр. С. 4.

10 Гл.: Ktoczowski J . Op. cit. P. 115.

11 Гл.: Kosman M . Op. cit. S. 130.

12 Гл.: Ktoczowski J . Op. cit. S. 115.

13 Гл.: Kosman M . Op. cit. S. 131-132.

14 Гл.: Вольдемаръ А . І . Національная борьба въ Великомъ Княжестве Литовскомъ въ XV и XVI векахъ // Йзвестія отделенія русскаго языка и словесности Императорской Академій Наукь. 1909 г. СПб., 1910. Т. XIV. Кн. 3. С. 164; Propolanis K. Polskie Apostolstwo w Litwie (szkic Historyczny 1387-1912 г.). Wilno, 1913. S. 7.

15 Гл.: Лапіцкі М. Праваслаўе ў Вялікім княстве Літоўскім за часоў панавання Уладыслава Ягайлы. Нью-Йорк, 1978. С. 105-106.

16 Гл.: Mironowicz A. The Orthodox Church and Byelorussian People. Biatystok, 2001. P. 46.

17 Евдокимов П.Н . Православие. М., 2002. С. 52.

18 Гл.: Дворник Ф. Славяне в европейской истории и цивилизации. М., 2001. С. 275.

19 Гл.: Halecki O.Op. cit. P. 40.

20 Гл.: Ibid. P. 43-44; Ktoczowski J. Op. cit. S. 134.

21 Гл.: Ibid. S. 132.

22 Гл.: Дворник Ф. Указ. соч. С. 287.

**Паступіў у рэдакцыю 12.11.2004.**

***Андрэй Уладзіміравіч Любы*** - аспірант кафедры гісторыі Беларусі старажытнага часу і сярэдніх вякоў. Навуковы кіраўнік- кандыдат гістарычных навук, дацэнт Ю.Л. Казакоў.